Падтрымай "Вясну" на PATREON

# На Уладзіміра Хільмановіча склалі пратакол за Дзень памяці паўстанцаў

02.12.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Праваабаронца Уладзімір Хільмановіч

Гарадзенскі публіцыст і праваабаронца Уладзімір Хільмановіч атрымаў на рукі пратакол пра нібыта адміністрацыйнае правапарушэнне – удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве ў Свіслачы і Якушоўцы 30 кастрычніка бягучага году – мітынгу і шэсці.

Па інфармацыі "Гарадзенскай Вясны", пратакол, складзены ў Свіслацкім РАУСе маёрам міліцыі Андрэем Песнякам, Хільмановічу перадаў супрацоўнік міліцыі Ленінскага РАУС Аляксей Вайцешка. Акрамя Уладзіміра Хільмановіча аналагічныя пратаколы складзены яшчэ на чатырох гарадзенцаў – Міколу Лемяноўскага, Эдварда Дмухоўскага, Віктар Сазонава і Сяргея Верамеенку. Такія ж пратаколы складзены і на грамадскіх актывістаў з іншых гарадоў Беларусі. Свіслацкі актывіст Юры Глебік Свіслацкім раённым судом ужо засуджаны да 40 базавых велічынь штрафу, мастоўскі актывіст Васіль Клімовіч, які ў той дзень увогуле не быў у Свіслачы – Мастоўскім раённым судом – да 9 базавых велічынь.

Уладзімір Хільмановіч каментуе сітуацыю:

*“Тыя структуры, якія называюць сябе міліцыяй і судом, насамрэч страцілі ўсе прыкметы дзяржаўных органаў, якія стаяць на варце Канстытуцыі і іншага заканадаўства краіны. Гэта тыя органы, якія ажыццяўляюць перадусім сачэнне і незаконны пераслед грамадскіх актывістаў. Я прыязджаю ў Свіслач ужо дваццаць пяць гадоў, амаль столькі ж – традыцыі фэсту Дзень памяці паўстанцаў 1863 году. Разам з сваімі сябрамі, некаторых з якіх ужо няма ў жывых, мы засноўвалі гэты фэст. За ўсе два дзясяткі гадоў удзельнікі свіслацкага Дня памяці аніводнага разу не парушылі заканадаўства. Аднак апошнія гады ўлады сістэмна і паслядоўна пераследуюць людзей фактычна за прысутнасць у Свіслачы, за ўскладанне кветак, за запальванне знічоў і за бел-чырвона-белы сцяг. Яны ўвесь час тупа пішуць у сваіх пратаколах пра наш нацыянальны сцяг – “не зарегистрированный в установленном порядке”. Суддзі гэтак жа тупа паўтараюць гэтую фразу і запісваюць яе ў пастановах, абвяшчаючы карныя выракі. Супраць гэтага “лому” няма ніякага прыёму. Аднак, бел-чырвона-белы сцяг – гэта нідзе і нічым не забароненая сімволіка. Таму мы маем справу з выключна пераследам грамадзян паводле палітычных матываў. Да ўсяго кожны грамадзянін нашай краіны мае права на гістарычную памяць і ўшанаванне продкаў, яго гарантуе Канстытуцыя дзяржавы і на гэта не патрэбна ніякіх выканкамаўскіх дазволаў”.*

За ўдзел у Свіслацкім Дні памяці паўстанцаў 1863 году Уладзімір Хільмановіч раней ужо штрафаваўся: у лістападзе 2014-га суддзёй Ленінскага раённага суда Гародні Аленай Пятровай на 35 базавых велічынь, а ў снежні 2015-га – суддзёй Свіслацкага раённага суду Жанай Салагубік на 40 базавых велічынь.

Твитнуть











Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"





## Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях”. Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



## #ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

## Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY